# ПАЛІТЫКА "РАЗБОРУ" ШЛЯХТЫ ПАД ЧАС ПРАЎЛЕННЯ М.М.МУРАЎЁВА НА БЕЛАРУСІ (1863-1865 г.).

**А.П. Грахоцкі**

Палітыка "разбору" шляхты Беларусі была распачата расійскімі ўладамі пасля падаўлення паўстання 1830-1831 гг. Паводле указа Мікалая I ад 19 кастрычніка 1831 г., асобы, якія не маглі падцвердзіць свайго дваранскага паходжання павінны былі прыпісацца ў новаўтвораныя катэгорыі аднадворцаў і граждан. Так, да пачатку 60-х гадоў XIX ст. каля 200 тыс. шляхцічаў у 9 заходніх губернях не змаглі прадставіць дакументы аб дваранскім паходжанні. Аднак, расійскае заканадаўства да 1863 г. не забараняла былым шляхцічам даказваць сваё дваранства.

Заняўшы пасаду Віленскага генерал-губернатара (травень 1863 г.), М.М.Мураўёў настойвае на прыняцці ў Пецярбургу стро-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гіх правілаў, якія зрабілі б механізм "разбору" шляхты дзейсным і беспаваротным. М.М Мураўёў пісаў аб неабходнасці рашучых мераў "ампутацыі" ў дачыненні да шляхты – "самого многочисленного и деятельного участника в настоящем мятеже". Так, ужо 12 ліпеня 1863 г. выйшаў указ Аляксандра II, які прыпыніў разгляд дакументаў аб дваранскім паходжанні "впредь до усмирения польского мятежа и разбора дел об ответственности мятежников". Затым па прапанове М.М. Мураўёва 23 верасня 1864 г. цар падпісаў указ, паводле якога усе без выключэння асобы, не зацверджаныя ў дваранстве, калі яны не мелі чыноў і званняў, якія б па законе вызвалялі іх ад дзяржаўных падаткаў і павіннасцяў, павінны былі да 1 студзеня 1865 г. запісацца ў падатковыя саслоўі. Фармальна дадзены указ не забараняў даказваць дваранскае паходжанне, але ўмовы, на падставе якіх магло адбыцца зацвярджэнне ў дваранстве, і сама працэдура доказу рабіла гэта амаль немагчымым: герольдыі забаранялася прымаць копіі дакументаў аб дваранскім паходжанні пры адсутнасці арыгінала; значна павялічваліся выдаткі, звязаныя з пошукам дваранства; на афармленне адпаведных дакументаў давалася толькі 4 месяцы. Гэтак, з 1863 г. па 15 лютага 1865 г. у Віленскай губерні да падатковых саслоўяў было прыпісана 33034 шляхціча. Для параўнання, за час з 1831 па 1857 г. у Мінскай губерні з шляхты ў саслоўе аднадворцаў і граждан было запісана 24613 чал. Усяго ж колькасць спадчыннага дваранства ў 6 губернях Паўночна-Заходняга краю ў 1867 г. скарацілася ў параўнанні з 1863 г. на 47%, з 324148 да 183938 чал. М.М. Мураўёў рабіў стаўку на перавод шляхты не ў асобныя станы аднадворцаў і граждан, а прыпісваў іх да былых памешчыцкіх сялян ці мяшчан, што сведчыла аб жаданні генерал-губернатара ліквідаваць усе ментальныя адрозненні гэтай катэгорыі дваранства ад такіх саслоўяў, як сяляне і мяшчане. Дадзеная палітыка М.М.Мураўёва была скіравана на знішчэнне найбольш палітычна актыўнай, здольнай змагацца за свае правы і ўласную годнасць праслойкі беларускага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ